Такі падыход да аналізу казкі, на наш погляд, дапаможа навучэнцам малодшых класаў зразумець жанравыя асаблівасці сацыяльна-бытавых казак, выявіць маральныя ўрокі, занатаваныя ў іх.

**Спіс літаратуры**


1. Антонава, Н. У. Літаратурнае чытанне : вучэб. дапам. для 2 кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з рус. мовай навучання : у 2 ч. / Н. У. Антонава, І. А. Буторына, Г. А. Галяш. – Мінск. : Нац. ін-т адукацыі, 2016. – Ч. 1. – 135 с.
2. Воропаева, В. С. Литературное чтение. 3-4 классы. Путешествие в мир сказки : пособие для учителей общеобразоват. учреждений с рус.яз. обучения/ В. С. Воропаева, Т. С. Куцанова. – 2-е изд. – Минск : Аверсэв, 2012. – 128 с.
3. Жуковіч, М. В. Літаратурнае чытанне : вучэб. дапам. для 3 кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання : у 2 ч. / М. В. Жуковіч. – Мінск. : Нац. ін-т адукацыі, 2017. – Ч. 2. – 118 с.
4. Жуковіч, М. В. Літаратурнае чытанне : вучэб. дапам. для 4 кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання : у 2 ч. / М. В. Жуковіч. – Мінск. : Нац. ін-т адукацыі, 2018. – Ч. 1. – 134 с.
5. Лазарева, В. А. Технология анализа художественного текста на уроках литературного чтения в начальной школе / В. А. Лазарева. – М. : Институт инноваций в образовании им. Л.В.Занкова: Издательский дом «ОНИКС 21 век», 2003. – 96 с.
6. Рабчук, М. Н. Инновационные подходы к работе со сказкой в начальной школе / М. Н. Рабчук // Современный урок языка и литературного чтения в начальной школе: эффективная организация образовательного процесса : сб. материалов регионального науч.-метод. семинара, Брест, 12 нояб. 2015 г. / Брест. гос. ун-т ; научный редактор Г. М. Концевая. – Брест, 2016. – С. 101–103.


---

## МАЎЛЕНЧА-КАМУНІКАТЫЎНЫЯ ЗАДАННІ ЯК ПРЫЁМ ФАРМІРАВАННЯ МАЎЛЕНЧА-КАМУНІКАТЫЎНАЙ КАМПЕТЭНЦЫІ


*Грыбко А.А.,*

*Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка, г. Мінск*



Анатацыя. Ва ўмовах блізкароднага руска-беларускага білінгвізму асаблівая увага ў працэсе навучання беларускай мове надаецца развіццю моўнай асобы, яе здольнасцей і творчага патэнцыялу, якія неабходны для актыўнай дзейнасці, сацыяльнага самавызначэння і самарэалізацыі.



*Ключавыя словы: моўная асоба, кампетэнтасны падыход, маўленча-камунікатыўная кампетэнцыя, сістэма практыкаванняў, інсцыніроўка, назоўнік.*


Моўная асоба – гэта чалавек, які валодае магчымасцю ствараць і ўспрымаць тэксты, якія адрозніваюцца:

1) ступенню структурна-моўнай складанасці;

2) глыбінёй і дакладнасцю адлюстравання рэчаіснасці;

3) пэўнай мэтавай накіраваннасцю [1].

*Кампетэнтнасны падыход* у навучанні мове прадугледжвае разам з атрыманнем ведаў пра мову развіццё ўменняў аналізаваць і сістэматызаваць

моўную інфармацыю, прымяняць яе ў маўленчай дзейнасці ў адпаведнасці з асобаснымі запатрабаваннямі для рашэння вучэбных, пазнавальных, практычных і камунікатыўных задач. Рэалізацыя гэтага падыходу мае на ўвазе фарміраванне ў вучняў шэрагу кампетэнцый. Кампетэнцыі ў моўнай адукацыі адлюстроўваюць здольнасць рэалізацыі моўных ведаў і ўменняў праз маўленчую дзейнасць у розных сітуацыях, у тым ліку ў працэсе навучання.

Вызначаецца маўленчы і камунікатыўны *напрамкі* навучання беларускай мове:

***маўленчы*** (авалоданне спосабамі перадачы думкі сродкамі мовы ў вуснай і пісьмовай формах, у розных відах маўленчай дзейнасці: чытанні, слуханні, гаварэнні, пісьме);

***камунікатыўны*** (авалоданне культурай маўлення, правіламі маўленчых зносін, уменнямі ствараць самастойныя вусныя і пісьмовыя выказванні розных відаў) [2].

Для фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі ў вучэбнай праграме ставяцца наступныя *задачы*:

– выпрацоўка камунікатыўных уменняў і навыкаў вучняў;

– развіццё практычных уменняў і навыкаў выкарыстання беларускай мовы ва ўсіх відах маўленчай дзейнасці;

– развіццё творчых здольнасцей вучняў пры стварэнні ўласных вусных і пісьмовых выказванняў [2].

*Змест маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі, якая фарміруюцца пры вывучэнні беларускай мовы на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі:* уключае валоданне рознымі відамі маўленчай дзейнасці; фарміраванне маўленчых паводзін, адэкватных мэтам і сітуацыям зносін; уменні выкарыстоўваць лексічныя адзінкі ў адпаведнасці з іх значэннем, выбіраць патрэбную моўную форму і спосабы выказвання думкі ў залежнасці ад умоў камунікацыі.

Каб супаставіць змест вучэбнай праграмы з падручнікам, я ўзяла падручнік па беларускай мове для 4 класа для школ з рускай мовай навучання аўтара В.І. Свірыдзенка [3]. У першым раздзеле «Паўтарэнне» вучні ўспамінаюць і замацоўваюць набытыя веды ў папярэдніх класах. Калі прасачыць па падручніку, якія аўтар прапануе заданні, то можна заўважыць, што яны ў той ці іншай ступені садзейнічаюць развіццю беларускага маўлення, заданні накіраваны на тое, каб вучні больш размаўлялі, разважалі, пашыралі свой слоўнікавы запас.

*Прыклады заданняў:*

Прачытайце тэкст. Калі адзначаецца Дзень ведаў? Чаму вучэнне з’яўляецца працай? Як зрабіць гэту працу радаснай?

Прачытайце прыказку. Чаму так гавораць?

Прачытайце верш. Якія дзівосы адбываюцца ў прыродзе ў пачатку восені?

Падбярыце аднакараневыя словы да выдзеленага слова.

Загадайце аднакласнікам беларускія загадкі, якія вы ведаеце.

Растлумачце значэнне апошняга слова ў сказе.

Прыдумайце і запішыце сказ. Выкарыстайце ў ім па адным слове з кожнага рада. Вызначце род назоўнікаў.

Раздзел, які больш за ўсё накіраваны на развіццё маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі, называецца «Тэкст». Вывучэнне раздзела «Тэкст» мае практычную накіраванасць і забяспечвае выпрацоўку ў вучняў неабходных ведаў і ўменняў для актыўных маўленчых дзеянняў па стварэнні тэкстаў. Асаблівасцю вывучэння тэксту з’яўляецца тое, што ён разглядаецца як вынік маўленчай дзейнасці. Асноўнымі задачамі вывучэння раздзела «Тэкст» у IV класе з’яўляюцца фарміраванне ўяўленняў пра сродкі сувязі сказаў у тэксце, пра ролю вобразна-выяўленчых сродкаў мовы ў тэксце, знаёмства з асаблівасцямі будовы тэкстаў розных тыпаў (апавяданне, апісанне, разважанне).

*У падручніку ў гэтым раздзеле прапанаваны наступныя заданні:*

Прачытайце. Дакажыце, што вы прачыталі тэкст.

Што дапамагае звязаць сказы ў тэксце?

Прачытайце тэкст. Як хлопчык дапамагаў бацьку? Як дрэвы дзякавалі яму?

Пра што ідзе размова ў кожнай частцы?

Якія словы паўтараюцца ў тэксце? Як пазбегнуць вялікай колькасці паўтораў? Выкарыстайце словы з правага слупка і выпраўце тэкст. Дайце яму назву.

Чаму складана перадаць на малюнку змест трэцяга тэксту?

Апішыце словамі малюнкі, якія можна намаляваць да тэксту-апавядання. што б вы адлюстравалі на малюнку да тэксту-апісання? Раскажыце, чым любяць займацца вашы сваякі. якія ў іх ёсць калекцыі?

Якія сучасныя сродкі сувязі вы ведаеце? Як можна павіншаваць сваякоў і знаёмых з рознымі святамі? Як можна даслаць ім патрэбную інфармацыю?

Вусна складзіце тую частку, якой не хапае.

У наступных раздзелах падручніка аўтар прапаноўвае аналагічныя заданні, накіраваныя на развіццё маўлення. Большасць заданняў пачынаецца са слоў раскажы, патлумач і г.д.

Тыя заданні, якія прапануе нам аўтар падручника, яны, канешне, вельмі добрыя, накіраваны на развіццё вуснага і пісьмовага (напісанне сачынення або пераказу) маўлення. Але каб добра засвоіць мову, на мой погляд, вучні павінны мысліць па-беларуску, ужываць яе штодзённа ў кожнай жыццёвай сітуацыі. Уключэнне ў вучэбны працэс заданняў, што інсцыніруюць пэўную жыццёвую сітуацыю, на мой погляд, будзе садзейнічаць фарміраванню маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі навучэнцаў. Напрыклад:

*1. Я з бабуляй на пошце;*

*2. Мой ранак у школе;*

*3. Паводзіны ў грамадскім транспарце.*

*4. Я з матуляй у магазіне;*

*5. Як пачынаецца мой ранак дома.*

Такое заданне можна даваць і пры вывучэнні назоўніка. Назваўшы пералік жыццёвых сітуацый, якія трэба праінсцыніраваць, на дошцы запісваюцца апорныя словы-назоўнікі, якія не толькі дапамагаюць вучням, але і пашыраюць іх слоўнікавы запас.

Зразумела, што такія заданні павінны выкарыстоўвацца не толькі на ўроках беларускай мовы, але і на ўроках літаратурнага чытання, а таксама на ўроках па дысцыпліне «Мая Радзіма Беларусь», і нават, калі гэта магчыма, у групе падоўжанага дня.

Працэс фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі ўключае ў сябе розныя сродкі, разнастайныя заданні, але самым лепшым з'яўляюцца практыкаванні.

**Спіс літаратуры**

1. Сцяцко, П. У. Слоўнік лінгвістычных тэрмінаў / П. У. Сцяцко, М. Ф. Гуліцкі, Л. А. Антанюк. – Мінск : Выш. школа, 1990. – С.83.
2. Учебная программа для общеобразовательных учреждений с русским языком обучения и воспитания для 4 класса / Министерство образования Республики Беларусь. – Минск : НИО: «Аверсэв», 2012.
3. Свірыдзенка, В. І. Беларуская мова : вучэбны дапаможнік для 4 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. – У дзвюх частках. – Мінск : НІА, 2018. – 144 с.

---

## МЕСТО ЛЕКСИКО-СЕМАНТИЧЕСКОГО РАЗБОРА В ОРГАНИЗАЦИИ СЛОВАРНОЙ РАБОТЫ НА УРОКАХ ЛИТЕРАТУРНОГО ЧТЕНИЯ

*Григорович Н.П.,*
*Оршанский колледж УО «Витебский государственный университет имени П.М. Машерова», г. Орша*

Аннотация. В данной статье рассматривается актуальная проблема повышения качества лексико-семантического анализа в ходе словарной работы на уроках литературного чтения. Автор исследует эффективные пути организации лексико-семантического разбора и его влияние на понимание младшими школьниками текста художественного произведения.

*Ключевые слова: словарная работа, лексико-семантический разбор, восприятие художественного произведения.*

Формирование представлений о слове как о двусторонней единице, обладающей формой и значением, начинается с начальной школы. При этом осуществляется комплексный подход к слову, оно рассматривается как явление лексическое и грамматическое, а именно: лексическое значение, звукобуквенный состав, грамматические особенности, морфемный состав, правописание, употребление в речи.